# НАПЕРАДЗЕ – АБЛАСНЫ ЭТАП

У сярэдзіне кастрычніка ў нашай альма-матар прайшоў агульнаўніверсітэцкі конкурс «Студэнт года ВДУ», у якім прынялі ўдзел выключна дзяўчаты. Кожны з дзесяці факультэтаў прадставіў сваю прэтэндэнтку. Да фінальнага этапу конкурсу дайшлі шэсць студэнтак – лепшых у вучэбнай, навукова-даследчыцкай, грамадскай, спартыўнай і творчай дзейнасці па выніках мінулага вучэбнага года.

Агульнаўніверсітэцкі этап конкурсу ўключаў у сябе такія выпрабаванні, як «Партфоліа», конкурс прэзентацый кніг «Крыніцы мудрасці», інтэлектуальны конкурс «Мая краіна – Беларусь» і творчы конкурс «Беларусь – культурная».

Першае выпрабаванне прайшло загадзя. Канкурсанткі прадставілі інфармацыю пра сябе, свае дасягненні ў вучобе, навуцы, спорце і творчасці.

Мэтай другога выпрабавання стала максімальна цікава расказаць пра сутнасць выбранай кнігі, заахвоціць прысутных да яе прачытання. Тут удзельніцы разам з групамі падтрымкі стваралі невялікія тэатральныя выступленні, у аснове якіх – сюжэты кніг класікаў і сучасных аўтараў беларускай літаратуры.

Сутнасць інтэлектуальнага конкурсу заключалася ў кароткім вусным выступленні. Кожная ўдзельніца за сорак секунд мусіла выказаць сваё стаўленне да пэўнай праблемы, дэманструючы сваё аратарскае ўменне, лагічнасць, культуру маўлення і крэатыўнасць мыслення. Тэмы выступленняў былі разнастайныя: ад праблем камп'ютарнай залежнасці да пытанняў аб патрэбнасці ў сучасным свеце вышэйшай адукацыі.

У апошнім выпрабаванні дзяўчаты дэманстравалі свае творчыя здольнасці, здзіўляючы гледачоў вакальным, харэаграфічным і акцёрскім майстэрствам.

Пасля ўсіх выступленняў члены журы выйшлі з залы, каб вызначыць прызёраў і пераможцу конкурсу. Для аб'яўлення вынікаў была запрошана на сцэну старшыня журы, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Першамайскага раёна Наталля Сакалова.

– На жаль, сёння мы не ўбачылі хлопцаў-канкурсантаў. Але дзяўчатам асобная падзяка за тое, што яны аказаліся вельмі актыўнымі і ўпэўненымі ў сабе, – адзначыла Наталля і аб'явіла імёны прызёраў.

Паводле вынікаў конкурсу трэцяе месца заняла студэнтка факультэта фізічнай культуры і спорту Дзіяна Казарэз, другая прыступка п'едэстала ў канкурсанткі факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій Яны Цывіс. Лепшай стала Наталля Тарарышкіна, студэнтка філалагічнага факультэта. З рук кіраўніка моладзевага тэатра «Колесо» Кірыла Сіліванава дзяўчаты атрымалі дыпломы і падарункі.

Варта нагадаць, што пераможца будзе прадстаўляць універсітэт на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года» 10 лістапада ў актавай зале ВДМУ.

**Андрэй ШЧАРБІЦКІ,**
**выпускнік ФлФ.**








**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**